# «Па-за кадрам» свята

**Беларускае кіно ў снежні адзначае сваё 100-годдзе. Да гэтай знамянальнай даты распрацаваны план святочных мерапрыемстваў.**

Адно з іх — рэспубліканскі кінафестываль «Кінавек». У яго праграму ўваходзяць найлепшыя фільмы Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», якія кожны тыдзень (з 28 лютага да 11 снежня) дэманструюцца ў сталічным кінатэатры «Піянер». Перад паказамі арганізаваны творчыя сустрэчы з акцёрамі, рэжысёрамі, сцэнарыстамі і аператарамі, выступленні гісторыкаў кіно і кінакрытыкаў. Значнай падзеяй стане міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «100 гадоў беларускага кіно: этапы, фільмы, майстры», якая пачнецца 12 снежня і будзе праходзіць у Нацыянальнай акадэміі навук, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, на кінастудыі «Беларусьфільм». 17 снежня ў Палацы Рэспублікі пройдзе ўрачысты вечар, прысвечаны юбілею беларускага кіно, які завершыцца святочным канцэртам.

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (2024, № 10), што выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, змешчаны дадатак «100 гадоў беларускага кіно: гісторыя і сучаснасць» (складальнік Г. В. Брага). У ім прадстаўлены матэрыялы пра ўзнікненне, развіццё і вытворчасць беларускага кіно; расказваецца пра фільмы з залатога фонду айчыннага кінамастацтва, прыводзяцца звесткі пра іх стваральнікаў. Дадатак складаецца з наступных раздзелаў: «Беларускі кінематограф: этапы развіцця», «Гісторыя, захаваная ў кадры: кінахроніка і дакументальныя фільмы», «Ігравы кінематограф», «Свет беларускай анімацыі», «Мінскі міжнародны кінафестываль "Лістапад"». Усе раздзелы суправаджаюцца нарысамі па тэме і бібліяграфічным спісам.

**Кацярына ВАРАНЬКО**